Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва»

# Віртуальная выстава

## *«Лідзія Арабей: сэрцам да Цёткі, словам да людзей… »*



*да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніцы і літаратуразнаўцы Лідзіі Львоўны Арабей*

**Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва прадстаўляе віртуальную выставу «Лідзія Арабей: сэрцам да Цёткі, словам да людзей… », прысвечаную беларускай пісьменніцы і літаратуразнаўцы Лідзіі Львоўне Арабей, якой 27 чэрвеня 2025 года спаўняецца 100 год.**

Упершыню дакументы Лідзіі Львоўны Арабей паступілі ў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва 18 снежня 1974 года ад самой пісьменніцы. Гэта машынапісы з аўтарскай праўкай апавяданняў эцюда «Шчасце» (1971), «Вакансія» (1972), «Камень» (1972), «Бэзавы цвет» (1973), «Вузлы» (1973). Захоўваецца ў фондах машынапіс з аўтарскай праўкай крытыка-біяграфічнага даследавання «Цётка (Алаіза Пашкевіч)» (1955), машынапісы артыкулаў «Песні дуды беларускай» (1965), «Час далёкі – час блізкі» (1965), «Бураю натхнёная» (1966), «Паэтэса – рэвалюцыянерка» (1966), «Хрэст на свабоду» (1966) і інш.

Другое паступленне адбылося 16 сакавіка 2015 года ад пляменніцы Лідзіі Львоўны - Ірыны Генадзьеўны Шыдлоўскай. На захаванне ў архіў-музей паступілі біяграфічныя і творчыя дакументы пісьменніцы, пісьмы ад дзеячоў літаратуры і мастацтва, ад сваякоў і знаёмых, дзіцячыя фотаздымкі з маці, сямейныя фотаздымкі з мужам – вядомым беларускім мастаком Яўгенам Ганкіным, фотаздымкі з дзеячамі літаратуры. Сярод выяўленчых дакументаў значную частку займаюць фотаздымкі, зробленыя падчас адпачынку і вандровак. Напрыклад, паездка ў Кітай прадстаўлена асобным фотаальбомам. Усяго паступіла больш за 200 дакументаў.

*Лідзія Львоўна Арабей нарадзілася 27 чэрвеня 1925 года ў вёсцы Нізок Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых. Дзявочае прозвішча – Качкоўская. Яна страціла бацьку, калі ёй было два гады. Разам з маці ў пошуках лепшага жыцця пераехалі ў Мінск, дзе маці працавала, а Ліда вучылася ў школе да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны.*



Лідзія з маці Махнач Мар'яй Антонаўнай. 1926



Лідзія Качкоўская [1931]

Алесь Махнач (брат маці) [1916]



*Напачатку вайны Ліда, яшчэ зусім юная – ёй было ўсяго 17 – знайшла прытулак у Шчучыне, ратуючыся ад голада. Там яна пазнаёмілася з хлопцам Аляксеям Арабеям, які быў з Сенніцы, што пад Мінскам. Яны пажаніліся. На вялікі жаль, ім не было суджана стаць шчаслівымі. За сувязь з партызанамі фашысты расстралялі Аляксея. Арабей – ягонае прозвішча, Лідзія Львоўна годна насіла ўсё сваё жыццё.*


Справка

Я нижеподписавшийся бывший командир партизанского отряда им Пономаренко Ворошиловской бр Остапович Виктор Александрович оперирующий во время В. Отечественной войны в Липичанской пуще настоящим подтверждаю в том что граж Арабей Алексей Алексеевич состоял агентом агентурной разведки давал ценные сведения о замыслах врага а также о передвижении вражеских частей распространял нелегальную литературу за что был арестован немецким гестапо в 1944 г.

Бывший коман отряда им Пономаренко

Подпись и показания гр-на Остаповича Виктора Александровича заверяю Секретарь Щучинского РК КПБ /Шилель/

19. VIII. 1971 г


С П Р А В К А

Выдана АРАБЕЙ Лидии Львовне – жене АРАБЕЙ Алексея Алексеевича.

Я МЮЛЛЕР Борис Николаевич во время Великой Отечественной войны находился в Щученском партизанском соединении Гродненской области БССР, командир соединения тов. Щупеня С.П. работал в подпольной партизанской типографии, где редактором был тов. Шилов.

Для нашей типографии шрифты, краску, бумагу доставляли из г. Лида партизанские разведчики живше в г. Лида, в частности, редактор тов. Шилов называл одного из них тов. АРАБЕЙ А.А.

После соединения партизан с частями Советской армии в 1944 году я был оставлен в г. Щучин Гродненской обл. и назначен заведующим типографии районной газеты " Чрвоны Сцяг " где была редактором АРАБЕЙ Александра Федоровна – мать АРАБЕЙ А.А., которая мне подробно рассказала, что действительно ее сын АРАБЕЙ А.А. был партизанским ра разведчиком и осенью 1943 года был с группой своих товарищей схвачен гестапо и растрелян.

Подпись /Б. Мюллер /

Дубовский район, Ростовской обл. Комиссаровский совхоз

Собственноручную подпись тов. Мюллер Б.Н.

Дубовский Райисполком Ростовской области

заверяет.

ПРЕД. ИСПОЛКОМА /Воробьев М/

Даведкі аб пошуку звестак пра мужа Аляксея Аляксеевіча Арабея [1970-я]


Александра Федоровна проявила себя как честный, выдержанный, принципиальный работник.

7/IV-70 г.


Справка

Я, Тедько Михаил Гордеевич, бывший секретарь райкома партии Щучинского района, подтверждаю, что Арабей Александра Федоровна работала редактором районной газеты „Чырвоны сцяг" с 1944 по 1948 год. В своей автобиографии Арабей Александра Федоровна указала, что сын ее Арабей Алексей Алексеевич расстрелян немцами за связь с партизанами. За время работы редактором газеты Арабей



Лідзія Арабей. 1947



Копия

ДИПЛОМ

В № 786958

Предъявитель сего тов. АРАБЕЙ ЛИДИЯ ЛЬВОВНА в 1946 г. поступила и в 1951 г. окончила полный курс филологического ф-та Белорусского Государственного Университета им. В.И.Ленина по специальности русский язык и литература, белорусский язык и литература и решением Государственной Экзаменационной Комиссии от 30 июня 1951 г. ей присвоена квалификация филолога.

Председатель Государственной Экзаменационной Комиссии /подпись/ И.Гуторов

Директор / подпись/ И.Чимбург

круглая герб. печать Секретарь / подпись неразборчива/

город Минск, 2/VII 1951 г.

Регистрационный № 226

1951 г. августа 13 дня. Я, Государственный нотариус нотариальной конторы Сталинского района г. Минска Бажонова Е. И.




*Са Шчучына маладая ўдава вяртаецца ў разбураны Мінск да маці.*
*Вайна скончылася, і маладыя людзі зноў пачалі марыць, а атрыманне адукацыі стала адной з самых запаветных мэт. Лідзія скончыла вячэрнюю школу і ў 1946 годзе паступіла ў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя В.І.Леніна на філалагічны факультэт.*

*Спалучаючы заняткі з работай у рэдакцыях часопіса «Вожык» і газеты «Чырвоная змена» /1946-1951/, Лідзія скончыла ў 1951 годзе універсітэт.*
*У сваіх успамінах пісьменніца выказвала словы падзякі Кандрату Крапіве (земляку і трохі сваяку), які ў цяжкую для яе часіну ўладкаваў дзяўчыну на работу ў дом Міхася Лынькова, тагачаснага старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў. Яна парадкавала там паперы, адказвала на тэлефонныя званкі. Потым з той жа місіяй трапіла ў дом Якуба Коласа.*

Індывідуальныя фотаздымкі Л.Арабей. 1947





Якуб Колас і Лідзія Арабей. 1940-я




ДИПЛОМ
КАНДИДАТА НАУК
МФЛ № 000004
Москва 3 января 1960 г.
Решением
Совета Белорусского Государственного университета им. В.И. Ленина
от 30 января 1959 г. (протокол N 17/352)
Арабей Лидии Львовне
ПРИСУЖДЕНА УЧЕНАЯ СТЕПЕНЬ КАНДИДАТА ФИЛОЛОГИЧЕСКИХ НАУК
Председатель Совета
Ученый Секретарь Совета



Л. Арабей падчас выступу. 1960-я

*У 1954 годзе Л.Арабей скончыла аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Я.Купалы АН БССР. А ў 1958 годзе абараніла кандыдатскую дысертацыю па тэме «Жыццё і творчасць Цёткі (Алаізы Пашкевіч)».*

*Як згадвала сама Лідзія, яна стала пісьменніцай дзякуючы Цётцы. "У мяне наогул усё пачалося з таго, што ў аспірантуры я выбрала тэму па творчасці Алаізы Пашкевіч. І ўсёй душой, усёй істотай, усімі сваімі пачуццямі ўвайшла ў гэтую тэму. І першая мая кніга – пра Цётку, – гаварыла Лідзія Львоўна. – Я абараніла дысертацыю, але з гэтай тэмай не развітвалася, трыццаць гадоў аддала вывучэнню творчасці Цёткі. А потым неяк само сабой лягло на паперу тое, што выпала перажыць: падзеі вайны, галеча і пакуты акупацыі, радасць вызвалення роднай зямлі ад фашыстаў".*

Караліна Пашкевіч (сястра А. Пашкевіч), Л. Арабей. 1977







Л. Арабей з сваякамі Цёткі.






ПРЭЗІДЫУМ

На 2 асобы

ПАВАЖАНЫ ТАВАРЫШ!

ЗАПРАШАЕМ ВАС
на ўрачысты вечар, прысвечаны
100-годдзю з дня нараджэння
выдатнай беларускай паэтэсы-рэвалюцыянеркі

ЦЁТКІ
(Алаізы Пашкевіч).

Вечар адбудзецца 15 ліпеня г.г.
у Доме літаратара (вул. Фрунзе, 5).

Пачатак у 19 гадзін.

ПРАГРАМА

I
Уступнае слова — народны паэт Беларусі,
Герой Сацыялістычнай Працы
Максім ТАНК.

II
Жыццё і паэзія Цёткі —
доктар філалагічных навук,
паэт Алег ЛОЙКА.

III
Выступленні пісьменнікаў і дзеячаў мастацтваў.

IV
Мастацкая частка.

САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР
МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ БССР

1876-1976

Запрашэнне да ўдзелу ў мерапрыемстве да 100-годдзя Цёткі. 1976



Лісты К. Буйло да Л. Арабей з успамінамі пра Цётку. 1973

*У 1956 годзе выйшла першае крытыка-біяграфічнае даследаванне «Цётка (Алаіза Пашкевіч)».*

*Пазней з-пад пяра пісьменніцы выйшлі дакументальныя аповесці пра Цётку “На струнах буры”(1967) і “Стану песняй”(1977), мастацкі твор “На полымі любві”(2006).*



Паважаная Лідзія Львоўна!
Вялікі дзякуй Вам за пісьмо. Выбачайце, што затрымаліся з адказам. Мы так чакалі вельмі чакалі, што не дачакаліся Вас на наша свята. Так, для школы гэта было вялікай надзеяй і сапраўдным святам.
Ваша кнігі пра А. С. Пашкевіч далі багаты матэрыял для экскурсій на музею. Хацелася б мець у нашым музеі кнігу пра Цётку, няхай сабе і на рускай мове, з Вашым аўтографам. Падкажыце нам, калі ласка, куды яшчэ звярнуцца, каб больш даведацца пра родных і блізкіх А. С. Пашкевіч.
Чакаем Вашых парад
03.11.83 г.
Члены савета музея Цёткі
Хоронкевіч
Южэ
Нефёдова






Паважаная Лідзія Львоўна!
Пішуць Вам члены савета музея А. С. Пашкевіч (Цёткі). Вялікі дзякуй за ўсё, што зроблена Вамі для ўвекавечання памяці нашай слаўнай зямлячкі.
Выбачайце за турботы, але ў нас ёсць да вас вялікая просьба. Напішыце, калі ласка, пра лёс сваякоў Цёткі, тых, што ў Пальчы. У нас былі нейкія паважаныя людзі з Мінска, яны гаварылі пра нейкія габелены, якія нібыта вы перададзіце музею як дар ад Нарашіны Пашкевіч. Выбачайце, калі тут што не так. Напішыце нам, калі ласка, па адрасу: 231536 Гродзенская вобл., Шчучынскі р-н, г.п. Астрына, Астрынская СШ імя Цёткі Савету музея.
Усяго добрага вам.
Члены сав. музея.







Лісты і віншавальныя паштоўкі да Л. Арабей.

*Лідзія Арабей падтрымлівала сувязі са Шчучынам доўгія гады, як з людзьмі, так і ў якасці даследчыка творчасці Алаізы Пашкевіч, ураджэнкі Шчучыншчыны.*
*Пісьменніца сябравала з супрацоўнікамі Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі, дзе захоўваюцца падараныя аўтаркай кнігі з аўтографамі і подпісамі ў адрас шчучынцаў. Прыязджала пісьменніца і ў Астрыну, перадала адзінаму на Беларусі музею Цёткі ўнікальныя экспанаты – фотаздымкі, дакументы, кнігі.*
*У фондзе Арабей знаходзяцца лісты, віншавальныя паштоўкі да Лідзіі Львоўны ад супрацоўнікаў Шчучынскай раённай бібліятэкі імя Цёткі, музея Цёткі ў Астрыне.*



Дарагая Лідзія Львоўна!
Вас віншуюць з Новым годам вашы шчырыя чытачы СШ №1 г. Шчучына, члены гуртка беларускай літаратуры. Мы працягваем традыцыі нашых былых членаў гуртка – вывучаем наш родны край, нашу беларускую літаратуру аб Гродзеншчыне. Нядаўна закончылі чытаць вашу аповесць „Сярод ночы." Зоя Аляксандраўна, сіраўнік гуртка, зацікавіла нас Вашымі творамі.
Віншуем, яшчэ раз, Вас, Лідзія Львоўна, з набліжаючымся Новым 1976 годам. Жадаем вам моцнага здароўя, многа новых добрых твораў, вялікіх поспехаў у жыцці.
Члены літ. гуртка СШ №1.
г. Шчучын. 27/XII.1975 г.



Дарагія Лідзія Львоўна і Яўген Маркавіч, добры дзень!
Шчырае Вам дзякуй і за дапамогу і за падарункі і за апошні ліст — адным словам за ўсё. Вы, напэўна, адчулі, я вельмі ўдзячна лёсу, што ён пазнаёміў нас. Гэта цудоўна, калі чалавек сустракае людзей, каля якіх можна адпачыць душой, нават працуючы.
Навін асаблівых у нас за гэты час яшчэ не адбылося. Але радуе хаця б і тое, што цяпер не толькі мы ідзем да людзей па нашай справе, але і людзі звяртаюцца да нас. Гэтыя два дні працягваю тэ-

лефонныя перамовы. Званілі да нас з радыё — іх вельмі зацікавіла наша праблема. Выраталі кампрыцу свае перадачы. Я ім дапамагала адшукаць неабходны матэрыял пра Л. Г. Шырноўскага. Званілі Элеаноры Іванаўне Вежур, якая арганізавала нам запіс на радыё. А сення сустрэлася з братамі Махначамі, сваякамі Кандрата Кандратавіча. На колькі я зразумела, адзін з братоў кіруе фальклорным ансамблем і збіраецца нас часці запрасіць на юбілеі Паўлюка Труса.
Сяргей Алегавіч, як заўсёды, насмі чарговай нашай перапалкі, са мной не сябруе. Але пра Дзмітрыя Міхайлавіча рапартуе, што займаецца пошукам сродкаў у камерцыйных структурах. Я вельмі ўдзячна Вам за падарунак, які Вы даслалі

Сяргею Алегавічу — ён яму даставіў задавальненне. Ну, а мой бясцэнны супруг займаецца ўтаймаваннем нашых рэальных бюракратычных структур. Астатнія настаўнікі працуюць у нармальным рытме.
Хапае забот і нашым дачуркам. Яны аператыўна прымаюць тэлефонныя званкі, ужо ўсіх вераюць па голасу. А ў свабодны час набіваюць сабе шышкі на ілбу.
Вось такія нашы навіны.
14.04.94.

Ліст ад землякоў. 1994



2010 год — год юбілейны Лідзіі Арабей! 27.06, в. Нізок, Уздзенскі раён.

адрас адпраўшчыка і індэкс прадпрыемства сувязі

Дарагая і вельмі шаноўная наша Лідзія Львоўна Арабей! Пісьменніца, вучоная, журналістка, перакладчыца і проста цудоўны Чалавек! Цёпла, радасна, захоплена віншуем Вас з 2010 годам, годам Вашага Юбілею! Агромністага Вам шчасця, здзяйснення ўсіх Вашых мараў і задумаў, моцнага здароўя і новых дасягненняў на ўсіх ранах Вашай працы і дзейнасці!
Нізка-нізка схіляемся перад Вамі
[illegible] — Уладзімір Кісялёў — [illegible] — Міхась [illegible]

Каму
Куды
Індэкс прадпрыемства сувязі месца назначэння
РУП "Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А. Ц. Непагодзіна" зак. 0161-08, т. 2000

2010



Художник В. Дергилева

Уважаемая Лидия Львовна!
Примите наши самые теплые поздравления с праздниками I Мая и Днем Победы.
Желаем Вам доброго здоровья, творческих успехов, семейного благополучия.
Узденский историко-краеведческий музей.

Пишите индекс предприятия связи места назначения



1987

*Заўсёды з цеплынёй і радасцю віталі Лідзію з візітамі і на яе малой радзіме – у вёсцы Нізок Уздзенскага раёна. Лісты ад землякоў былі ніткай, што звязвала яе з роднай зямлёй.*

*Працоўная біяграфія Лідзіі Арабей была разнастайная.*
*У 1955 - 1967 гг. яна працавала галоўным рэдактарам мастацкай літаратуры ў выдавецтве «Беларусь», з 1967 па 1973 гг. – літсупрацоўнікам у рэдакцыі часопіса «Полымя». А з 1973 года цалкам аддалася пісьменніцкай дзейнасці.*



І. Пташнікаў, А. Русецкі, Л. Арабей, П. Кавалёў, А. Бачыла. Творчая размова ў рэдакцыі часопіса «Полымя» [1970-я]



Пасяджэнне рэдакцыі часопіса «Полымя» на чале з К.Кірэенкам. Сярод удзельнікаў Л. Арабей, А. Вялюгін, А. Русецкі, І. Чыгрынаў, Р. Шкраба, В. Якавенка, Б. Сачанка, І. Пташнікаў, Г. Пашкоў [1972-1974]

Пасля даследчай працы пра Алаізу Пашкевіч (Цётку) у 1959 годзе выйшла даследаванне «Фядос Шынклер».

Пазней талент пісьменніцы раскрыўся ў літаратурных творах. У 1958 годзе Лідзія Арабей была прынята ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, што стала пацвярджэннем яе значнага ўкладу ў беларускую літаратуру. Яна з’яўляецца аўтарам зборнікаў аповесцяў і апавяданняў «Калібры» (1960, апавяданні для дзяцей), «Кватэра № 3» (1961, кніга сатыры і гумару), «Мера часу» (1962), «Экзамен» (1963), «Ларыса» (1964), «На струнах буры» (1967), «Сярод ночы» (1968), «Іскры ў папялішчы» (1970), «Ваўчкі» (1972), «Сіні бор» (1972, аповесць), «Мне трэба ехаць» (1974), «Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы» (1980), «Паласа дажджу» (1984), «Пошукі кахання» (1987), «Ісці ў разведку» (1989, апавяданні для дзяцей), «Пошукі ісціны» (абразкі, 2005), «Белае поле» (апавяданні, ўспаміны, 2008).

У 1985 годзе выйшлі Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Акрамя ўласнай творчасці Лідзія Арабей мела перакладніцкі вопыт – пераклала раман эстонскага пісьменніка А. Хінта «Бераг вятроў» (з А. Раманоўскай, 1960).









Л. Арабей з супругам Яўгенам Ганкіным [1980- я]

*Лідзія пазнаёмілася са сваім другім супругам – Яўгенам Ганкіным амаль адразу пасля вяртання ў Мінск.*
*Яўген Маркавіч Ганкін – вядомы беларускі мастак. З 1946 года ён працаваў мастаком-пастаноўшчыкам на кінастудыі ‘‘Беларусьфільм’’.*
*З Яўгенам Ганкіным Лідзію Арабей звязалі гады моцнага шлюбу і цёплых адносін. Іх жыццё было напоўнена яркімі падзеямі, цікавымі вандроўкамі і сустрэчамі.*



*Падарожжы былі неад'емнай часткай жыцця Лідзіі Арабей. У складзе савецкіх дэлегацый яна пабывала ў розных кутках свету, ад Грэцыі да Кітая. БДАМЛМ захоўвае фотаздымкі, якія адлюстроўваюць гэтыя незабыўныя моманты.*

*«Мы хадзілі па мармуравым пляцы, сярод агромністых мармуровых глыб – рэшткаў старажытных збудаванняў, фатаграфаваліся на фоне Парфенона, на фоне карыятыд, каля велізарных мармуровых камянёў. А як было не падзівіцца на панараму, якая адкрывалася з Акропаля на Афіны.»*
*Арабей Л. Паласа дажджу: Аповесць, апавяданні, малюнкі з падарожжа. – Мн.: Маст. літ.,1984*



У Грэцыі падчас падарожжа па Еўропе.
[1970-я]




*Вялікую цікавасць у фондзе Л.Арабей прадстаўляе альбом з фотаздымкамі падчас падарожжа ў Кітай. Подпісы ў альбоме зроблены самой Лідзіяй Львоўнай.*







*Акрамя традыцыйных турыстычных фотаздымкаў увагу звяртаюць здымкі працоўных, гандляроў, маці з дзецьмі, школьнікаў – тых, хто складае штодзённае жыццё кітайскіх гарадоў. Пісьменніцы вельмі хацелася зазірнуць за фасад вядомых мясцін і ўбачыць тых, хто за імі стаіць, чыя праца і клопаты робяць гэтыя месцы жывымі.*

[1950-я]



Лідзія Арабей у групе з беларускімі пісьменнікамі падчас камандзіроўкі па Хабараўскім краі. 1962

14 УП 2

ПРЕДСЕДАТЕЛЮ ВСЕСОЮЗНОГО БЮРО
ПРОПАГАНДЫ ЛИТЕРАТУРЫ
тов. ЛЯШКЕВИЧУ Д.Е.

Мы, группа белорусских писателей, в составе: Лидии Арабей, Янки Брыля, Нила Гилевича, Сергея Граховского, Наума Кислика, Валентина Тараса с 9 июня по 9 июля 1962 г. находились в Хабаровском крае по командировкам Всесоюзного бюро пропаганды литературы.

За это время нами проведено более тридцати литературных выступлений на предприятиях, в совхозах, колхозах, библиотеках, учебных заведениях, заводских клубах и рабочих общежитиях.

Наше пребывание в Комсомольск-на-Амуре совпало с тридцатилетием города. На встрече с комсомольчанами мы передали им библиотечку произведений белорусских писателейс автографами.



*Працуючы ў літаратурнай сферы, Лідзія Арабей была знаёма са многімі вядомымі пісьменнікамі. У архіве-музее захоўваюцца дакументы, якія сведчаць аб яе працоўных і сяброўскіх сувязях. Гэта лісты, паштоўкі, запрашэнні на юбілейныя вечары і інш. На выставе прадстаўлены успаміны пісьменніцы пра Кандрата Крапіву, Івана Мележа, Янку Брыля, Івана Навуменку. Захаваныя аўтографы і машынапісы нагадваюць пра іх сустрэчы і размовы, пра тую атмасферу творчасці і ўзаемнай падтрымкі, якая панавала ў адносінах.*



Паважаны таварыш!

ПРАЎЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР ЗАПРАШАЕ ВАС НА ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ 50-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ВЯДОМАГА БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕННІКА ІВАНА ПАЎЛАВІЧА МЕЛЕЖА.

ВЕЧАР АДБУДЗЕЦЦА 8 ЛЮТАГА 1971 ГОДА У ДОМЕ МАСТАЦТВАЎ (ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 26).

ПАЧАТАК У 19 ГАДЗІН.



Паважаная Лідзія Львоўна!

Запрашаю Вас прыняць удзел у таварыскай вячэры з нагоды майго пяцідзесяцігоддзя.

Вячэра адбудзецца ў рэстаране "Беларусь" 9 лютага. Пачатак а 7 гадзіне вечара.

Іван Мележ

Іван Мележ

Запрашэнне на юбілейны вечар, прысвечаны 50-годдзю І. Мележа на імя Л. Арабей



Лідзія АРАБЕЙ

З СЯМЕЙНАГА АРХІВА

У чорныя дні акупацыі, у глухім на той час мястэчку Шчучын, куды закінула мяне ваеннае ліхалецце, у нашу хату, хату партызанскага сувязнога, разам з іншай падпольнай літаратурай трапіў сатырычны часопіс "Раздавім фашысцкую гадзіну", а ў ім фельетон Кандрата Крапівы "Наглядная геаграфія", пра тое, як немец, прыехаўшы з фронту на пабыўку, расказваў сваёй фраў, дзе і як ён атрымаў свае раны. Нельга перадаць словамі ўражанне, якое зрабіў на мяне гэты фельетон. Я смяялася і плакала, чытаючы яго. Смяялася дасціпнасці кожнага радка, а плакала з радасці, што жыве наша роднае, што не ўседзяць немцы доўга на нашай зямлі, што блізка, блізка ўжо наша вызваленне.

З гэтым фельетонам я сустрэлася яшчэ раз -- у бібліятэцы Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі. Пад пергаментнай паперкаю, пад пэўным нумарам, адзінкаю захавання, ён, напісаны рукою самога Кандрата Крапівы, ляжаў у пачэсным сховішчы. Я быццам сустрэла старога знаёмага, быццам фельетон гэты праз многія гады зноў трапіў да мяне, зноў узрушыўшы, хоць



2

ужо і іншым узрушэннем -- адчулася нешта падобнае на непарыўнасць часу, на бессмяротнасць.

Цяпер арыгінал гэтага фельетона захоўваецца ў школьным музеі вёскі Нізок "Роднае слова," у арганізацыю якога былы дырэктар школы Дзмітрый Мікалаевіч Суткаленка і выкладчыца гісторыі Вольга Міхайлаўна Суткаленка, выкладчык французскай мовы Сяргей Алегавіч Армонік і іншыя настаўнікі ўклалі шмат старання і працы.

На жаль, школы ў Нізку цяпер няма і музей той мала і рэдка хто наведвае. А дарэмна. Бо той жа фельетон Кандрата Крапівы абышоў усю Беларусь, паспрыяў перамозе над фашызмам і запыніўся ў вёсцы Нізок, дзе нарадзіўся Кандрат Крапіва. Там жа, дарэчы, нарадзілася мая мама Марыя Антонаўна Махнач, нарадзілася і я.

Па ўзросце мая мама была блізкая да свайго знакамітага земляка, у маладосці яны бавілі час, кажучы на сённяшні манер, у адной кампаніі і мне, ужо школьніцы, якая ведала на памяць шмат вершаў і баек Кандрата Крапівы, разумела, які гэта славуты чалавек, мама расказвала, што нарадзіўся ён у вельмі бедны

Л. Арабей. Успаміны пра К. Крапіву. Машынапіс.



3

Успамін

Вестка пра смерць Івана Мележа напаткала мяне ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

— Памёр Мележ...

Гэта вестка мяне апякла, бо я высока ставіла творчасць Мележа і паважала яго як спагадлівага чалавека.

Малады і прыгожы

Л. Арабей. Успаміны пра І. Мележа. Аўтограф.



АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ імя Янкі Купалы

АКАДЕМИЯ НАУК БССР
ИНСТИТУТ ЛИТЕРАТУРЫ имени Янки Купалы

г. Мінск, Ленінскі праспект, 66, тэл. 3-88-87

№ 21/81 «6» XI 1981 г.

Уважаемая Лидия Львовна!

Институт литературы им. Янки Купалы АН БССР в соответствии с постановлением Совета Министров БССР готовит десятитомное Собрание сочинений народного писателя БССР Ивана Мележа. В Собрание сочинений предполагается включить также эпистолярное наследие писателя. В этой связи обращаемся к Вам с большой просьбой – предоставить в распоряжение редакционной коллегии письма Ивана Павловича к Вам, если таковые имеются. Вы также оказали бы нам большую услугу, если бы рассказали о себе, пояснили, когда началась Ваша переписка с Иваном Павловичем и в связи с какими конкретными событиями написано то или иное письмо. Эти сведения будут использованы в комментариях к письмам.

Директор Института академик АН БССР

И.Я.Науменко




Віншавальная паштоўка ад Я. Брыля да Л. Арабей. 1989






Л. Арабей. Успаміны пра Я. Брыля. Аўтограф.


ЛІДЗІЯ АРАБЕЙ

СЯРОД НОЧЫ

Лідзія Арабей

СЯРОД НОЧЫ

Аповесці, апавяданні

Дарагому
Івану Пятровічу
з нязменным
пачуццём
чалавечай сімпатыі
і глыбокай павагі
15/IV-68 г. Л. Арабей

ВЫДАВЕЦТВА „БЕЛАРУСЬ" МІНСК 1968

Дароўны надпіс І. Шамякіну


Глыбокапаважаная
Лідзія Львоўна!

Вельмі рад сустрэцца і па-
працаваць разам з Вамі. Шка-
да, што гэта выпала на зім-
ні час, і Вы не зможаце ўба-
чыць ва ўсім росквіце прыро-
ду Каўказа. Але, наведаўшы
наш край раз, Вы абавязкова
пажадаеце прыехаць сюды і
яшчэ і яшчэ.

Як да нас дабрацца? З вак-
зала Пяцігорска шостым ну-
марам аўтобуса да астаноў-
кі „Пошта" і ісці ў кірунку
гары Машук. Тут на вуліцы
Пушкінскай на правую руку


ў апошнім доме мы і жывём.
Наш тэлефон 26-38. Чакаем!

Да Вас невялічкая просьба.
У Вашым выдавецтве выйшла
кніжачка „На маім акне" для
дашкольнікаў. Я паслаў пакаль-
кі С. Міхальчуку, каб ён
дапамог мне атрымаць 50 экз.
праз „Кніга-поштай" накл. платай,
але чамусьці ніхто мне не
адказаў і я не ведаю ці будзе
выканана мая просьба, бо часу
ўжо мінула багата. А кніжкі
мне вельмі патрэбны для пад-
шэфных школ і дзіцяч. садоў.
„Кніга-поштай" (Чкалаўская, 27) мне
наогул ні разу не адказала
за апошнія два гады.

Пішыце, калі Вас чакаць.
З найлепшымі пажаданнямі

Вісар...

10.XII.66

Лісты В. Гарбука да Л. Арабей. 1966


Лідзія Арабей | Стану песняй

Дарагі
Сяргей Іванавіч!
Прыміце ад
мяне кнігу —
вынік шматгадовай
маёй работы.
З любоўю і
павагаю да Вас —
Л. Арабей
20.1.78 г.

Мінск | «Мастацкая літаратура» | 1977

Дароўны надпіс С.Грахоўскаму


Лідзія Арабей

СЯРОД НОЧЫ

Аповесці, апавяданні

Пімену
Емельянавічу
Панчанку
з глыбокай
павагаю
Л. Арабей
10/IV-68 г.

ВЫДАВЕЦТВА „БЕЛАРУСЬ" МІНСК 1968

Дароўны надпіс П. Панчанку

*У бібліятэцы БДАМЛМ захоўваюцца кнігі Лідзіі Арабей з дароўнымі надпісамі да знакамітых беларускіх пісьменнікаў.*


Маладосць і старасць
У маладосці і тое хочацца купіць, і тое, усё патрэбна, але няма грошай!
А ад старасці ёсць грошы, але нічога купляць не хочацца, ўсё здаецца, нічога і не трэба.
Будзе позна...
Я больш ніколі не ўбачу мора, я больш ніколі не ўбачу егіпецкіх пірамід, не ўбачу Рыма і Парыжа. Я ~~павінна дапаўніць з гэтым багажом~~ ... Маладыя, ... не дазваляюць мне рабіць цікавага.


памятаюць пра яго ...
Развітальнае
Некалькі гадоў шукала ісціну — на вуліцах, у хатах і г. д., у душах чалавечых. А ўласна — што такое ісціна? Ісціна — гэта праўда. А я знайшла — што ў кожнага свая праўда, у кожнага свая ісціна. Ну ... Жывіце кожны па сваёй праўдзе, толькі не рабіце ~~людзям зла~~. адзін другому зла. Бывайце!

Абразкі Л. Арабей. “Пошукі ісціны”. Аўтограф [2000-я]

*Лідзія Арабей застанецца ў нашай памяці як таленавітая празаік, аўтарка пранікнёных аповесцей і апавяданняў, аўтарытэтны даследчык гісторыі беларускай літаратуры і шчыры чалавек.*

*Юбілейная выстава «Лідзія Арабей – жыццё і творчасць праз стагоддзе» дае магчымасць па-новаму зірнуць на творчасць пісьменніцы, адкрыць для сябе невядомыя факты яе біяграфіі, асэнсаваць ролю Лідзіі Львоўны ў развіцці беларускага літаратуразнаўства.*


[1970-я]


[1980-я]

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. БДАМЛМ. — Ф. 202. — Воп. 1.
2. БДАМЛМ. — Ф. 531. — Воп. 1.

3. Арабей Лідзія // Беларускія пісьменнікі (1917—1990): Даведнік / Склад. А. К. Гардзіцкі. Нав. рэд. А. Л. Верабей. — Мн.: Мастацкая літаратура, 1994.

4. Арабей Лідзія // Беларускія пісьменнікі: Біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. / пад рэд. А. І. Мальдзіса. — Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1992—1995.

5. СБ. Беларусь сегодня. «Заставацца на полымі любві». https://www.sb.by/articles/zastavatstsa-na-polym-lyubv-.html. Дата доступу: 02.06.2025.

6. Шчучынская раённая газета Дзянніца. «Шчучыншчына ў жыцці Лідзіі Арабей».
https://dzyannica.by/content/shchuchynshchyna-u-zhycci-lidzii-arabey
Дата доступу: 28.05.2025.

7. Звязда. «Успаіны. Лідзія Арабей: не трэба здяйсняць гераічных подзвігаў, трэба проста не рабіць гадасцяў».
http://zviazda.by/ru/node/191020
Дата доступу: 20.05.2025


Аўтар выставы: В.В.Біруля